# БЕЛЫ СНЕГ

Слова Г. БУРАВКИНА

Ноты с сайта www.notarhiv.ru




снег, бе_лы снег, бе_лы снег — бе_лы дзень... Ты ку-
-ды мя_не клі_чаш, пас_лу - хай?— За_ві - ру_ха мя_це, за_ві_ру - ха... На два-
-рэ ні ма_шын, ні люд_зей, на два_рэ ні ма_шын, ні люд_зей, за - ві-
- ру - ха мя_це, за_ві - ру - ха, ты ку_ды мя_не клі_чащ, па_слу - хай, на два-




Белы снег, белы снег, белы снег—белы цень...
Белы снег, белы снег, белы снег—белы дзень...
Ты куды мяне клічаш, паслухай?—
Завіруха мяце, завіруха...
На дварэ ні машын, ні людзей...

Белы снег, белы снег, белы снег—белы след...
Белы снег, белы снег, белы снег—белы свет...
За табой асцярожна ступаю,
Засыпае нас снег, засыпае,
Патрапляю у замецены след...

Белы снег, белы снег, белы снег—белы клён...
Белы снег, белы снег, белы снег—белы сон...
Як паходня, твой шаль ружавее,
На зямлі—я і ты, і завея.
І вакол—ні вачэй, ні вакон...